**КЛІМАШЭЎСКІ Аляксандр Іосіфавіч.** Нарадзіўся 13 снежня 1933 г. у в. Чарніхава Баранавіцкага раёна Брэсцкай вобласці (Баранавіцкі павет Навагрудскага ваяводства) у сялянскай сям'і. Беларус. Скончыў факультэт фізічнай культуры Беларускага інстытута фізічнай культуры па спецыяльнасці "Фізічная культура" з наданнем кваліфікацыі "Выкладчык фізічнага выхавання" (1955). Працаваў выкладчыкам СШ № 3 г. Брэста (1955–1971), трэнерам па плаванні ДЮСШ г. Брэста (1971–1974). З 1974 г. – асістэнт кафедры тэорыі і методыкі фізічнага выхавання, кафедры спартыўных дысцыплін, з 1980 г. кафедры фізічнага выхавання. Старшым выкладчыкам кафедры фізічнай культуры Брэсцкага педінстытута працаваў з 1987 г. па 1994 г. З выхадам на пенсію – выкладчык кафедры фізічнай культуры БрДУ па тэрміновым працоўным дагаворы (1994–2005). Аўтар 18 публікацый. Выдатнік народнай адукацыі БССР (1966). Узнагароджаны медалямі "За выратаванне тапельцаў" (1968), "Ветэран працы" (1984), Ганаровым знакам Таварыства ратавання на вадзе СССР (1990). Даследаваў праблемы фізкультурна-аздараўленчай работы з навучэнскай моладдзю, тэорыі і методыкі фізічнага выхавання, спартыўнай трэніроўкі і аздараўленчай фізічнай культуры.